■ Эпоха

# ПАМІЖ БЕЗДАННЮ, СУЧАСНАСЦЮ І БУДУЧЫНЯЙ

**«PAX SOVIETICA» — так называецца выстаўка фотамастака Георгія Капуснікава, якая працуе ў Музеі сучаснага мастацтва ў Мінску. Яе адкрыццё было прымеркавана да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па шматлікіх просьбах гледачоў работу экспазіцыі працягнулі — са здымкамі можна азнаёміцца да канца тыдня.**



Георгій Капуснікаў, як ён сам адзначае, пажыў у Савецкім Саюзе ўсяго чатыры дзіцячыя гады. Аднак тыя перажыванні пакінулі моцны след у яго жыцці. Малады чалавек і цяпер, праз 26 гадоў пасля распаду імперыі, збірае аскепкі мінулага часу, імкнецца адрэстаўраваць страчаную эпоху. І, трэба адзначыць, у яго гэта атрымліваецца. Вядома ж, кола гісторыі круціцца — і час назад не адматаць. Але ў працах фотамастака ёсць асаблівая цэласнасць — і ўбачыць праз іх можна не толькі воблік колішняй краіны.

Гэты аўтар умее бачыць прыгажосць у паўсядзённым, на першы погляд звычайным. І гэта не прыцягнутае за вушы хараство — маўляў, я аўтар, я так бачу. У работах Георгія закінутыя вышкі выглядаюць велічнымі тытанамі з мінулага. Заводы, пабудаваныя больш як 50 гадоў таму, выдыхаюць дым і пару, нібы сапраўдныя вулканы. Краявід старых чыгуначных рэек акжывае дзякуючы птушцы, што над імі пралятае, ці настойлівым прамяням сонца, якія з'яўляюцца на шэрым небе.



Вялікая ўвага ў творчай манеры гэтага аўтара аддаецца драбніцам. Надзвычай цікава разглядваць сфатаграфаваныя кавалкі вітражоў, сцен са старой, савецкага часу, кладкай, каляровых мазаік, зробленых на тых вокнах, за якімі ўжо даўно не загараецца святло... Зазвычай да прадметаў мастацтва нельга дакранацца рукамі. Але ж калі знаёмішся з работамі Георгія, утрымацца ад такой спакусы вельмі складана. Так і хочацца адчуць прахалоду рознакаляровых шкельцаў, спраўдзіць шурпатасць жаўтаватай цэглы. Але на тактыльным узроўні фотаздымкі, вядома, — гэта толькі папера. А такое імкненне «пакаштаваць» работу падкрэслівае ўменне майстра. Значыць, у фотаздымках сапраўды жыве душа тых аб'ектаў, што на іх адлюстраваны. І душа майстра, які карпатліва збірае неаднастайнае пано мінулай эпохі — якой яна была і якой дайшла да нашага часу.

Большасць фотаздымкаў зроблена аўтарам у Беларусі і Расіі. Адлюстраваны і некаторыя іншыя краіны СНД. Капуснікаў адзначае, што праз яго работы можна ўбачыць істотную розніцу паміж рэальнасцю і тым светам, які можна было ўбачыць раней. І параўнанне гэта часцей за ўсё не на карысць першай.

Адзін з яго любімых твораў, тых, што найбольш поўна раскрываюць задуму, — трыптых, выкананы ў шэрых колерах. Насамрэч гэта барэльефы, сфатаграфаваныя на стэле ў Амурскай вобласці. На іх можна ўбачыць рабочых, моцных і рашучых у сваім дзеянні. «Гэта серыя фотаздымкаў пра тое, колькі можна адкрыць у сабе сіл, калі тыя, хто іх не мае, будуць давяраць табе ў тым, што ты робіш, — разважае Георгій. — Часта табе давяраюць, калі ты сам упэўнены».

Адна з падтэм выстаўкі — забруджванне. Пра гэта расказваюць шыльды, сфатаграфаваныя ў тых месцах, дзе калісьці былі атрутныя газы, выявы аскепкаў тых прадпрыемстваў, дзе іх выраблялі ці ўтрымлівалі, і непасрэдна рэчы, прывезеныя з тых заводаў. «Забруджванне можа быць не толькі хімічнае», — мяркуе аўтар. — «Заражаныя» людзі маюць уласцівасць «заражаць» навакольных людзей і тэрыторыю. Людзі хвараюць па слабасць. Сімптом гэтага атручэння — няўпэўненасць у сабе». Так фотамастак характарызуе наш час.

— Я імкнуўся, каб адчуванне слабасці і няўпэўненасці не заставалася пасля прагляду, — кажа фатограф. — У пэўных месцах відаць кантрасты: што было і што стала. Дзесьці пра гэта можна толькі здагадвацца.

«PAX SOVIETICA» — гэта некалькі паверхаў фотаздымкаў. Аднак гэта яшчэ і экспазіцыя рэчаў тых часоў, сабраных разам. І да таго ж відэаінсталяцыя. Для таго каб падрыхтаваць відэашэраг, аўтар ездзіў у Беларускі Дзяржаўны архіў кінафотавідэадакументаў у Дзяржынску. Там яму ўдалося атрымаць архіўныя стужкі, якія яскрава ілюструюць імкненне савецкага чалавека падпарадкаваць прыроду і выпрабаваць мяжу чалавечых здольнасцяў. Напрыклад, можна ўбачыць, як у свой час будавалася Гідраэлектрастанцыя на Дняпры — як дзеля гэтага перакрывалі рэчышча і спынялі плынь вялізнай, магутнай ракі.

На выстаўцы можна прачытаць анатацыю, напісаную самім Георгіем Капуснікавым, якая добра ілюструе яго бачанне свету:

### ПОКЛІЧ

*Мы прыйшлі з гор, старажытных і маладых, з бязмежных стэпаў, пустынь і Тайгі. Можа быць, мы — Голас, усвядомлены імпульс бязмежнага лесу, які раскінуўся на мільёны кіламетраў? Менавіта голас лесу, а не той, якім людзі кажуць за яго. Паспрабуем прыслухацца, якім бы незразумелым, дзікім і звярыным ён ні здаваўся, бо мы ўсе прыйшлі адтуль, як бы ні імкнуліся пра гэта забыць. Схілім галовы, напоўненыя тысячагадовым дабром, перад манументальнасцю мільёнаў гадоў...*

### ФІНАЛ?

*...Бо мы ўсе ўжо амаль дома. Яшчэ імгненне — і ўжо не атрымаецца разыгрываць больш гэтую пантаміму. Застынем, гледзячы прыжмуранымі вачыма ў вечнасць, а вусны кране лёгкая ўсмешка. Інакш прыйдзецца пачынаць з нуля, шукаць адказы ў апалай лістоце, калі жаданне ахоўваць прыроду ад саміх сябе канчаткова не пазбавіць людзей і гэтай магчымасці.*

### ПОМНІКІ БУДУЧЫНІ

*Хутка свет вельмі моцна зменіцца. І Будучыня можа наступіць у любы момант. Змены будуць падобныя да рэвалюцыі, з той толькі розніцай, што ў гэтай рэвалюцыі будзе значна менш слёз і крыві. Бо яны абясцэніліся, праліваючыся кожны дзень. Ці будуць гэтыя змены да лепшага ці горшага — ніхто не ведае. Адно відавочна: у Будучыню шырокай плынню імкнуцца не самыя лепшыя з чалавечых душ, адцясняючы сучаснае, абясцэньваючы дасягнутае. Быць можа, наша задача ў тым, каб спадчына і вопыт мінулага не былі страчаны цяпер, пакуль яны яшчэ жывыя і атачаюць нас. Праз шмат гадоў, баючыся зрабіць наступны крок — як гэта было заўсёды, — мы зноў паглядзім назад, у сваё мінулае, але ўбачым толькі адбіткі суб'ектыўнага ўспрымання сучаснікаў, якія да нечага засталіся абыякавымі, нешта ідэалізавалі, а нешта сказілі. І шмат чаго — ачарнілі. У любым выпадку гэта будзе погляд толькі ў копію Бездані, а не ў яе саму. І наўрад ці гэтая копія будзе валодаць глыбінёй і каштоўнасцю арыгінала.*

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
nina@zviazda.by

■ Сваімі словамі



# ПАРА КАМЯНЁЎ У ГАРОДЧЫК ХЭЛОЎІНА,

## або Пра тое жыццё, якое дала Рэфармацыя

**Мы жывём у свеце дзіўных супрацьлегласцяў. Паганскія святы чамусьці прыпадаюць на тыя ж дні, што і хрысціянскія. У той час як адзін чалавек прытрымліваецца строгага посту — другі ўвечары з дапамогай горкіх напояў праводзіць усё ліхое. Тое ж і са святам Хэлоўін, якое апошнім часам набірае ўсё большую папулярнасць. Хоць у гэты ж дзень калісьці адбывалася іншае знакавае дзейства.**

Цікавая сама трансфармацыя свята: у першапачатковым значэнні Хэлоўін — вечар напярэдадні Дня ўсіх святых, яго адзначалі зазвычай у англамоўных краінах. Аднак паступова дзейства перамянілася ў супрацьлеглае па сэнсе. Цяпер у ноч з 31 кастрычніка на 1 лістапада прынята ў пэўнай, хай сабе і жартаўлівай, форме звяртацца да нячыстай сілы.

Магчыма, не так заўважна гэта ў рэгіёне, аднак у сталіцы, калі ўвечары напярэдадні выйдзеш у горад, хутчэй за ўсё сустрэнеш якога-небудзь чорціка — мінака, апранутага ў цёмнае адзенне, з выбеленым тварам, намаляванымі чорнай фарбай упадзінамі пад вачыма ды яшчэ чырвонай крывавай усмешкай. Відовішча так сабе, я вам скажу. І сэнс яго, калі ўдумацца, небяспечны — своеасаблівае «братанне» з нячыстай сілай. Аднак ці трэба чалавеку, прывыкламу да размеранага жыцця, такое сяброўства? Бо не ўсё тое жарт, што на першы погляд можа падавацца смешным...

«Свята» гэтае апошнім часам робіцца ўсё больш і больш папулярным нават у нас (згодна з некаторымі звесткамі, зарадзілася яно ад кельцкай паганскай забавы). Цяпер Хэлоўін часта святкуюць цэлымі калектывамі як карпаратыўную падзею. Некаторыя вядомыя асобы дома робяць сабе такі «смяротны» макіяж, фатаграфуюцца, выкладваюць здымкі ў сеціва і тым спрабуюць падкрэсліць, што і яны ў трэндзе... Аднак я была б асцярожнай у гульнях з тымі з'явамі, паходжанне якіх застаецца для нас не да канца зразумелым.

Якая ж альтэрнатыва? Бо без свят, нейкага «варушняку» жыць сапраўды сумна. Варта прыгадаць, што акурат у той самы час, калі ладзіцца Хэлоўін, святкуецца яшчэ і Дзень Рэфармацыі. Зноў цікавае супадзенне-сумяшчэнне, ці не праўда?

Сёлета адзначалася не проста свята Рэфармацыі, але яе 500-годдзе! Так, падзея прагучала на ўзроўні некаторых культурных установ, сярод суполак дасведчаных у гэтай тэме людзей. Аднак для большасці Рэфармацыя засталася чымсьці з разраду: «Так, чулі пра перыяд у гісторыі, але гэта ж было так даўно...» Аднак насамрэч Рэфармацыя і тыя 95 тэзісаў, што 31 кастрычніка 1517 года Марцін Лютэр прыбіў да сцен мясцовай царквы ў Вітэнбергу, істотна змянілі свет.

Напрыклад, дзякуючы Рэфармацыі былі адменены індульгенцыі — грошы, якімі людзі нібыта мусілі разлічвацца за здзяйсненыя грахі ці грахі сваякоў. Новы парадак вярнуў чалавецтва да першакрыніцы, Бібліі, згодна з якой адпушчэнне грахоў магчымае праз добраахвотнае пакаянне і дзякуючы Хрысту. Так многія сем'і перасталі аддаваць апошнія грошы на «выкуп» сваіх памылак. Да таго ж людзям растлумачылі, што яны і самі, без абавязковага пасярэдніцтва пап, могуць звяртацца да Бога са сваімі праблемамі, клопатамі і радасцямі. Дарэчы, самога Лютэра напаткала прызнанне ерэтыкам — у такіх выпадках асуджаных звычайна спальвалі на вогнішчы. Аднак Лютэру ўдалося гэтага пазбегнуць: дзякуючы заступніцтву ўплывовых князёў, якія яго падтрымалі, і дзякуючы тым новым ідэям, якія ён распаўсюдзіў у грамадстве.



У той жа час была сфарміраваная так званая пратэстанцкая этыка працы, што істотна змяніла аблічча Еўропы. Краіны, якія закранула Рэфармацыя, сталі досыць багатымі. Было прызнана права кожнага чалавека на працу, самавыяўленне, раскрыццё сваіх здольнасцяў — у выніку сфарміравалася рынкавая эканоміка. Паўночнаеўрапейскія краіны, да гэтага бедныя і адсталыя, істотна змянілі сваё аблічча і пачалі квітнець.

Рэфармацыя прызнала роўнасць усіх людзей незалежна ад сацыяльнага паходжання, статусу. Былі адкрытыя шматлікія навучальныя ўстановы. Інстытут сям'і зноў зрабіўся свяшчэнным. Дарэчы, Марцін Лютэр выступіў і за тое, каб манахіні і манахі жаніліся, у тым ліку паміж сабой, — ён адчыніў дзверы манастыроў і паспрыяў многім шлюбам. Лютэр неяк сказаў, што манахі — гэта моль на каўняры Госпада. Скончылася ўсё тым, што ён і сам ажаніўся з былой манахіняй Катарынай фон Бора.

З ходу і не пералічыць усяго, што дала свету Рэфармацыя. Але варта і самім пацікавіцца гэтай тэмай — каб ацаніць усе тыя выгоды, якія сёння падаюцца нам звыклымі, бо прыняты ў грамадстве. Сумна, што замест таго каб вывучаць спадчыну Рэфармацыі, асэнсоўваць яе здабыткі і перавагі, многія святкуюць «цёмнае» свята Хэлоўін. Можа быць, трэба крыху змяніць прыярытэты і звярнуцца да таго, што насамрэч важна?

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
nina@zviazda.by